# ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА

УДК 82.0

***Ж. Л. Раманава***

## СПЕЦЫЯЛЬНЫЯ ФУНКЦЫІ ІНФАРМАЦЫЙНЫХ РЭСУРСАЎ МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Інфармацыйным рэсурсам у галіне мастацкай літаратуры (ІРМЛ), як і ўсім аб'ектам рэчавага свету, уласціва выкананне пэўных неабходных грамадству функцый, у якіх адлюстроўваюцца іх прызначэнне, асабістыя мэты і задачы.

Функцыі, якія выконваюцца ІРМЛ, прынята падзяляць на агульныя метасістэмныя і спецыяльныя. Агульныя метасістэмныя функцыі – інфармацыйная, кумулятыўная, пошукавая, ідэнтыфікацыйная – аднолькавыя для усіх відаў інфармацыйных рэсурсаў (ІР) увогуле і для ІРМЛ як часткі метасістэмы ІР, у прыватнасці. Спецыяльныя функцыі розных відаў ІР значна адрозніваюцца паміж сабой, і менавіта яны дазваляюць убачыць адметнасць, выключнасць і своеасабліасць тых ці іншых інфармацыйных рэсурсаў, даць іх характарыстыку і выявіць іх спецыфіку.

Спецыяльныя функцыі галіновых ІР – прадмет дыскусійны. Спрэчкі вядуцца ў першую чаргу вакол пытання аб суадносінах функцый, якія выконваюцца непасрэдна галіной, абслугоўваемай інфармацыйнымі рэсурсамі, і асабістых, уласных функцый інфармацыйных рэсурсаў.

У літаратуры існуе падыход, адпаведна якому функцыі абслугоўваемай галіны механічна пераносяцца на той від дзейнасці, які гэтую галіну абслугоўвае. Іншы пункт гледжання на дадзеную праблему прапанавала Н. А. Сляднева [7, с. 187–195], якая лічыць, што прамы перанос функцый абслугоўваемай галіны некарэктны і што ў дадзеным выпадку трэба гаварыць аб дзвюх групах функцый у адносінах да абслугоўваемага віду дзейнасці – аб функцыях абслугоўвання і функцыях рэдуплікацыі.

Гэты падыход уяўляецца нам найбольш мэтазгодным і ў дачыненні да функцыянальнай структуры ІРМЛ азначае наступнае. ІРМЛ выконваюць функцыі абслугоўвання ці, інакш кажучы, інфармацыйнага забеспячэння ў дачы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ненні да мастацкай літаратуры. Ім уласцівы тыя ж функцыі, што і мастацкай літаратуры. Адначасова і мастацкая літаратура выконвае і тыя функцыі, якія ўласцівы яе інфармацыйным рэсурсам. Паяснім дадзеныя палажэнні больш падрабязна.

Галоўнымі функцыямі любых галіновых рэсурсаў з'яўляюцца функцыі падтрымкі ці абслугоўвання той сістэмы, да якой яны маюць дачыненне, паколькі асноўнымі задачамі галіновых ІР выступаюць назапашванне, захаванне і распаўсюджванне ведаў, якія былі створаны ў нетрах пэўнай галіны, каб гэтыя веды маглі служыць для далейшага яе развіцця. Ю. М. Сталяроў назваў гэтыя функцыі сапартнымі [11, с. 25], Н. А. Сляднёва аналагічныя функцыі называе функцыямі абслугоўвання [7, с. 191–192].

Для ІРМЛ такія функцыі, на нашу думку, таксама з'яўляюцца асноўнымі, бо яны скіраваны на дапамогу мастацкай літаратуры ў ажыццяўленні яе асноўных мэт і задач, а значыць, на забеспячэнне яе жыццядзейнасці. Першую групу функцый – функцый абслугоўвання называем функцыямі інфармацыйнага забеспячэння, паколькі дадзеная назва больш адпавядае той ролі, якую яны выконваюць у адносінах да абслугоўваемага віду дзейнасці.

Наступная група ўключае функцыі самой мастацкай літаратуры як галіны дзейнасці (іх можна лічыць характэрнымі і для яе інфармацыйных рэсурсаў) і ўласныя функцыі ІРМЛ, якія выконваюцца таксама мастацкай літаратурай.

Апошняя група функцый уяўляе сабой функцыі рэдуплікацыі [7, с. 192–194].

Схематычна функцыі ІР мастацкай літаратуры можна прадставіць наступным чынам:

| Функцыі інфармацыйнага забеспячэння | Функцыі рэдуплікацыі | |
|---|---|---|
| | Функцыі мастацкай літаратуры, характэрныя і для яе інфармацыйных рэсурсаў | Функцыі інфармацыйных рэсурсаў мастацкай літаратуры, характэрныя і для самой мастацкай літаратуры |
| 1. Функцыя інфармацыйнага забеспячэння навукі<br>2. Функцыя інфармацыйнага забеспячэння адукацыі<br>3. Функцыя інфармацыйнага забеспячэння прафесійнай сферы<br>4. Функцыя інфармацыйнага забеспячэння шырокага кола карыстальнікаў | 1. Эстэтычная<br>2. Адукацыйныя<br>3. Пазнавальная<br>4. Развіццёвая.<br>5. Выхаваўчая<br>6. Духоўна-камунікатыўная<br>7. Эмацыянальная<br>8. Этнагенетычная<br>9. Геданістычная | 1. Мемарыяльная<br>2. Папулярызатарская<br>3. Аксіялагічная<br>4. Бібліятэрапеўтычная<br>5. Генерацыйная |

Разгледзім падрабязна функцыі інфармацыйнага забеспячэння.

*Функцыя інфармацыйнага забеспячэння навукі* – здольнасць ІР мастацкай літаратуры прадастаўляць карыстальнікам навуковую інфармацыю і каштоўны матэрыял, неабходны для навуковых даследаванняў. У першую чаргу такую інфармацыю ўтрымліваюць навуковыя акадэмічныя і неакадэмічныя выданні мастацкай літаратуры. Кожнае з іх абавязкова ўтрымлівае штосьці істотна новае для даследчыкаў літаратуры і з'яўляецца крыніцай фактаграфічнай і бібліяграфічнай інфармацыі.

Сярод бібліяграфічных рэсурсаў такую функцыю выконваюць навукова-дапаможныя бібліяграфічныя прадукты: агульнагаліновыя, тэматычныя, персанальныя, праблемна-тэматычныя, жанравыя, якія прызначаны задавальняць патрабаванні навуковага вывучэння літаратуры. Навукова-дапаможная бібліяграфічная прадукцыя садзейнічае даследаванню і падрыхтоўцы навуковых выданняў, твораў мастацкай літаратуры.

Функцыю інфармацыйнага забеспячэння навукі выконваюць і агульныя паказальнікі («Летапіс друку»), у якіх прадстаўлены звесткі аб усіх выданнях, што выйшлі з друку на тэрыторыі пэўнай краіны; галіновая рэтраспектыўная і перспектыўная бібліяграфічная прадукцыя. Рэтраспектыўныя паказальнікі арыентуюць карыстальнікаў у дакументных масівах за пэўны ўліковы перыяд. Інфармацыя, змешчаная ў іх, адрозніваецца паўнатой і дакладнасцю. Такія бібліяграфічныя прадукты вельмі карысныя для даследчыкаў літаратуры, якія імкнуцца вылучыць літаратуру па пэўнай тэме за працяглы перыяд часу, але інфармацыю аб новых выданнях патрэбна шукаць перш за ўсё ў бягучых агульных паказальніках. Перспектыўная бібліяграфічная прадукцыя таксама карысная для навукоўцаў, бо яна даводзіць да ведама карыстальнікаў звесткі аб яшчэ не выдадзеных, а толькі рыхтуючыхся да выдання дакументах. Гэтая інфармацыя не з'яўляецца поўнасцю дакладнай, але яна вельмі карысная для навукоўцаў, бо дазваляе зазірнуць у будучае дакументальнага патоку і загадзя арыентавацца ў ім. Такім чынам, выкарыстанне ўсіх відаў бібліяграфічнай прадукцыі дазваляе максімальна поўна арыентавацца як у патоку новай літаратуры, так і ў масіве літаратуры за даволі працяглы адрэзак часу, што дапамагае навукоўцам усебакова і шматаспектна даследаваць праблему і бачыць прабелы ў яе вывучэнні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Функцыя інфармацыйнага забеспячэння адукацыі* – здольнасць ІР мастацкай літаратуры забяспечваць работнікаў адукацыйнай сферы інфармацыяй, неабходнай ім для ажыццяўлення вучэбнага працэсу. Да першасных выданняў, што ажыццяўляюць дадзеную функцыю, адносяцца як асобныя масавыя літаратурна-мастацкія выданні, так і літаратурна-мастацкія выданні, якія выходзяць у складзе спецыяльных серый і ўтрымліваюць творы, вывучаемыя ў навучальных установах. Напрыклад, у серыі «Школьная бібліятэка» выдаюцца творы, якія ўключаны ў школьную праграму і абавязковыя для вывучэння.

У асяроддзі другасных інфармацыйна-бібліяграфічных выданняў гэтую функцыю выконваюць рэкамендацыйныя бібліяграфічныя выданні, прызначаныя для інфармацыйнага забеспячэння выкладчыкаў, настаўнікаў літаратуры сярэдняй школы, студэнтаў-філолагаў і інш. Некаторыя рэкамендацыйныя дапаможнікі маюць канкрэтнае мэтавае прызначэнне: у дапамогу пазакласнай рабоце са школьнікамі, для тых, хто вывучае спецкурсы, прымае ўдзел у спецсемінарах. Гэту функцыю таксама выконваюць бібліяграфічныя спісы, змешчаныя ў вучэбна-метадычных і навукова-метадычных дапаможніках, і семінарыі – комплексныя бібліяграфічныя і вучэбна-метадычныя (навукова-метадычныя) дапаможнікі. У іх прапануецца значная колькасць тэм для вывучэння і распрацоўкі. Па кожнай тэме даюцца прыблізны план яе распрацоўкі, метадычныя указанні да яе і бібліяграфічныя спісы літаратуры. Семінарыі могуць выкарыстоўвацца студэнтамі-філолагамі, выкладчыкамі як у вучэбнай, так і ў навуковай рабоце, а таксама чытачамі, якія паглыблена займаюцца літаратурнай самаадукацыяй.

*Функцыя інфармацыйнага забеспячэння прафесійнай сферы* – здольнасць ІР мастацкай літаратуры забяспечваць неабходнай інфармацыяй прадстаўнікой прафесійнай сферы, звязанай з літаратурнай камунікацыяй – бібліёграфаў, рэдактараў, журналістаў, перакладчыкаў, літаратурных агентаў і інш. Гэтую функцыю ў першую чаргу выконваюць навукова-масавыя і каменціраваныя масавыя выданні мастацкай літаратуры, а таксама другасныя крыніцы інфармацыі – у першую чаргу рэкамендацыйныя бібліяграфічныя паказальнікі, прыкніжныя і прыартыкульныя спісы літаратуры.

*Функцыя інфармацыйнага забеспячэння шырокага кола карыстальнікаў* – здольнасці ІР мастацкай літаратуры прадастаўляць тэксты твораў мастацкай літаратуры шырокаму колу чытачоў, для якіх чытанне мастацкай літаратуры з'яўляецца сродкам прыемнага і рацыянальнага правядзення вольнага часу, атрымання асалоды, задавальнення асабістых эстэтычных, духоўных, інтэлектуальных патрэбнасцей.

Рэкамендацыйныя бібліяграфічныя выданні выконваюць дадзеную функцыю, прадастаўляючы бібліяграфічныя спісы першасных выданняў, якія суправаджаюцца рэкамендацыйнымі характарыстыкамі і прызначаюцца шырокаму колу карыстальнікаў для дапамогі ім у працэсах адукацыі, самаадукацыі і правядзення вольнага часу. Уся сукупнасць рэкамендацыйнай бібліяграфічнай прадукцыі цэласна адлюстроўвае мастацкую літаратуру, задавальняе розныя аспекты інтарэсу чытачоў да яе (жанравы, персанальны, тэматычны, гісторыка-літаратурны і інш.) і мае магчымасць задавальняць інтарэсы ўсіх асноўных катэгорый чытачоў.

Акрамя таго, падрыхтаваныя чытачы могуць выкарыстоўваць і прадукцыю навукова-дапаможнай бібліяграфіі, якая мае магчымасць даваць поўную інфармацыю і задавальняць у поўнай меры тыя ці іншыя бакі чытацкіх інтарэсаў.

Разгледзім функцыі рэдуплікацыі. Спачатку звернемся да функцый мастацкай літаратуры, уласцівых таксама і яе інфармацыйным рэсурсам.

*Эстэтычная функцыя* – здольнасць ІР мастацкай літаратуры задавальняць патрэбу ў прыгожым, даваць эстэтычную асалоду, спрыяць уздыму эстэтычных пачуццяў, эмоцый, развіваць эстэтычны густ і ідэал.

Рэкамендацыйныя бібліяграфічныя прадукты выконваюць эстэтычную функцыю праз адбор, групоўку і рэкамендацыйную характарыстыку, якія садзейнічаюць цэласнаму эстэтычнаму ўспрыманню твораў, фарміраванню эстэтычнай свядомасці і густу.

*Духоўна-камунікатыўная функцыя* – здольнасць ІР мастацкай літаратуры, у адрозненне ад іншых ІР, наладжваць духоўныя кантакты паміж пісьменнікам і яго чытачамі, паміж мінулым, сучаснасцю і будучыняй.

Наладжванню духоўных кантактаў спрыяюць і выданні навукова-дапаможнай і, у большай ступені, рэкамендацыйнай бібліяграфічнай прадукцыі, задачай якіх з'яўляецца пасрэдніцтва паміж творамі мастацкай літаратуры і чытачом.

*Адукацыйная функцыя* – здольнасць ІР мастацкай літаратуры дапамагаць карыстальнікам авалодваць новымі творамі, адчыняць для сябе свет мастацкай літаратуры, павышаць адукацыйны ўзровень. Садзейнічае гэтаму рэкамендацыйна-бібліяграфічная прадук-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

цыя, якая праз свае сродкі: навуковы адбор, групоўку, асобую методыку рэкамендацыі твораў (абапіраецца на даныя літаратуразнаўства і будуецца з улікам узроставых і псіхалагічных асаблівасцей розных груп чытачоў, іх адукацыйнага ўзроўню) і навукова-дапаможны апарат стварае шырокае інфармацыйнае поле для авалодвання новымі мастацкімі вобразамі, дапамагае сістэматычнаму і планамернаму вывучэнню мастацкай літаратуры, удумліваму чытанню.

*Пазнавальная функцыя* – здольнасць ІР мастацкай літаратуры служыць своеасаблівым сродкам пазнання чалавека, яго псіхікі і навакольнага сусвету. Не з'яўляючыся навуковай, мастацкая літаратура пры дапамозе вобразнамастацкага адлюстравання рэчаіснасці здольна да паказу глыбінь чалавечай псіхікі, унутраных матываў яго ўчынкаў, фіксацыі найтанчэйшых душэўных рухаў. Яна сапраўды выконвае функцыі чалавеказнаўства.

З мастацкай літаратуры можна даведацца і аб розных навуковых фактах і гіпотэзах, адкрыццях, аб жывой і нежывой прыродзе, гістарычных падзеях і г. д. Усё гэта дапамагае чалавеку пазнаваць самога сябе, іншых людзей і навакольны свет.

Рэкамендацыйная бібліяграфічная прадукцыя дапамагае пазнанню мастацкай літаратуры, даводзячы да ведама чытача розныя звесткі аб мастацкіх творах, жыцці і дзейнасці пісьменнікаў. Папулярныя бібліяграфічныя энцыклапедыі, напрыклад, самі з'яўляюцца крыніцай цікавай інфармацыі, знаёмяць чытачоў з сучасным пунктам гледжання на тыя ці іншыя літаратурныя творы і з'яўляюцца крыніцай пазнання.

*Развіццёвая функцыя* – гэта здольнасць ІР мастацкай літаратуры рабіць уплыў на развіццё лагічнага і вобразнага мыслення, інтэлектуальных і творчых здольнасцей праз інтэнсіфікацыю работы розуму ў працэсе чытання, аналітычнае асэнсаванне зместу літаратурнага твора, абуджэнне фантазіі.

Акрамя таго, працэс чытання ІР мастацкай літаратуры спрыяе развіццю здольнасцей да пераказу, чытач навучаецца ўжываць у сваёй пісьмовай і вуснай мове мастацкія вобразы, павышаецца яго пісьменнасць і ўдасканальваецца яго вусная і пісьмовая мова.

Развіццёвая функцыя ўласціва і другасным ІР. Яна выконваецца рэкамендацыйнымі бібліяграфічнымі паказальнікамі, якія здольны фарміраваць і развіваць чытацкі густ, інтарэсы і патрэбнасці, узнімаць іх на больш высокі ўзровень, стымуляваць і развіваць духоўныя патрэбнасці чалавека.

*Выхаваўчая функцыя* – здольнасць ІР мастацкай літаратуры рабіць уплыў на фарміраванне сістэмы маральных прынцыпаў, унутраных ідэйных перакананняў, агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей, якімі кіруюцца людзі ў штодзённым жыцці, нацыянальнай свядомасці і патрыятызму.

Рэкамендацыйныя бібліяграфічныя прадукты таксама выконваюць выхаваўчую функцыю. Гэта праяўляецца ў тым, што яны садзейнічаюць выхаванню маральных якасцей чалавека праз папулярызацыю лепшых мастацкіх твораў, прасякнутых ідэямі агульначалавечай этыкі і маралі. Рэкамендацыйная характарыстыка гэтых твораў дае магчымасць рабіць выхаваўчае ўздзеянне на чытача і накіроўваць яго выбар. Акрамя таго, рэкамендацыйная бібліяграфічная прадукцыя здольна выхоўваць культуру чытання і ўспрымання мастацкіх твораў, інфармацыйную культуру асобы.

*Эмацыянальная функцыя* – здольнасць ІР мастацкай літаратуры да абуджэння эмоцый, пачуццяў, жадання падзяліцца імі з акружаючымі [8, с. 32].

У сферы другасных ІР гэтая функцыя ўласціва рэкамендацыйным бібліяграфічным паказальнікам, для якіх характэрна эмацыянальная насычанасць паведамленняў, што выклікае водгук у карыстальнікаў. Сам характар мастацкай літаратуры патрабуе эмацыянальна афарбаванай іх характарыстыкі. Нельга папулярызаваць твор, выклікаць да яго інтарэс без ясна выказаных эмацыянальных адносін да твора, без жывога і вобразнага расказу аб ім. Адна з задач рэкамендацыйнай бібліяграфічнай прадукцыі – выклікаць эмацыянальны водгук чытача на той ці іншы твор і тым самым звярнуць увагу на яго, зацікавіць ім, пабудзіць да чытання.

*Этнагенетычная функцыя* – здольнасць ІР мастацкай літаратуры быць духоўнай скарбніцай кожнай нацыі, захоўваць і ўвекавечваць нацыянальныя традыцыі, звычаі, мову, духоўныя каштоўнасці кожнай нацыі.

Дадзеная функцыя ўласціва і другасным ІР. Навукова-дапаможная і рэкамендацыйная бібліяграфічная прадукцыя служыць сродкам кумуляцыі і інфармацыйнага забеспячэння чытачоў крыніцамі мастацка-вобразнай інфармацыі этнагенетычнага характару. Рэкамендацыйныя паказальнікі арыентуюць чытача ў гэтых крыніцах, прадастаўляюць яго ўвазе найбольш каштоўныя з іх, а навукова-дапаможныя паказальнікі, асабліва рэтраспектыўнага характару, даюць карыстальніку магчымасць убачыць усё багацце нацыянальнага духу, характару і побыту, увасобленае ў творах мастацкай літаратуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Геданістычная функцыя* – здольнасць ІР мастацкай літаратуры забаўляць, прыносіць асалоду, быць сродкам адпачынку, цікавага і прыемнага выкарыстання вольнага часу.

У асяроддзі другасных ІР такую функцыю выконваюць рэкамендацыйныя бібліяграфічныя паказальнікі, якія з'яўляюцца сродкам інфармацыйнага абвяшчэння карыстальнікаў аб забаўляльным характары твораў мастацкай літаратуры, аб іх рэкрэацыйных магчымасцях. Лепшыя бібліяграфічныя паказальнікі, што падрыхтаваны творчымі і таленавітымі бібліёграфамі, якія выказваюць на іх старонках асабістыя меркаванні, назіранні і пачуцці аб прачытаных мастацкіх творах, і самі з'яўляюцца сродкам адпачынку і прыемнага правядзення вольнага часу. Характэрна гэта ў першую чаргу для рэкамендацыйных паказальнікаў так званых «гібрыдных» ці «пагранічных» жанраў: папулярных энцыклапедый, аглядаў і інш.

Уласныя функцыі ІР мастацкай літаратуры можна ахарактарызаваць наступным чынам.

*Мемарыяльная функцыя* – здольнасць ІР мастацкай літаратуры выступаць у якасці крыніцы захавання і ўвекавечвання гістарычных звестак аб развіцці грамадства, жыцці і дзейнасці розных гістарычных асоб, здольнасць служыць помнікамі быту і культуры, звычаяў пэўнай гістарычнай эпохі.

Для крыніц другаснай інфармацыі мемарыяльная функцыя заключаецца ў захаванні і перадачы ад аднаго пакалення людзей да іншых духоўнай спадчыны сусветнай цывілізацыі, заключанай у творах мастацкай літаратуры. Найбольшае ўвасабленне мемарыяльная функцыя знаходзіць у навукова-дапаможнай бібліяграфічнай прадукцыі, якая найбольш поўна і ўсебакова адлюстроўвае творы мастацкай літаратуры (што характэрна і для рэкамендацыйна-бібліяграфічнай прадукцыі).

*Папулярызатарская функцыя* – здольнасць ІР мастацкай літаратуры папулярызаваць сваімі сродкамі творчасць розных пісьменнікаў, розныя літаратурныя жанры, выклікаць цікавасць да іх і жаданне чытаць іншыя творы пэўных пісьменнікаў ці жанраў.

Папулярызатарская функцыя выконваецца ўсімі відамі рэкамендацыйных бібліяграфічных паказальнікаў – тэматычнымі, персанальнымі, жанравымі, агульналітаратурнымі. Увогуле, папулярызатарская функцыя – адна з найважнейшых і арганічных функцый рэкамендацыйнай літаратурнай бібліяграфіі і найбольш моцна праяўляецца ў яе інфармацыйнай прадукцыі.

*Аксіялагічная функцыя* – здольнасць ІР мастацкай літаратуры рабіць уплыў на фарміраванне духоўнай культуры грамадства, выбар прыярытэтных каштоўнасных арыентацый і маральных каштоўнасцей.

Дадзеная функцыя ўласціва рэкамендацыйна-бібліяграфічным рэсурсам у галіне мастацкай літаратуры, якія здольны рабіць уплыў на фарміраванне духоўнай культуры грамадства пры дапамозе наступных сродкаў: рэкамендацыйныя анатацыі, адбор і папулярызацыя твораў, дзе адлюстроўваюцца і прапагандуюцца высокія чалавечыя і нацыянальныя ідэалы, якія складаюць духоўны скарб чалавецтва і здольны найбольш паспяхова фарміраваць асобу чалавека.

*Бібліятэрапеўтычная функцыя* – здольнасць ІР мастацкай літаратуры выступаць сродкам тэрапеўтычнай дапамогі для сваіх карыстальнікаў. Чытанне пэўных мастацкіх твораў у цяжкія моманты жыцця здольна зняць псіхалагічную напружанасць, стрэс, даць адпачынак душы і розуму. Знаёмства з творамі, у якіх героі апынуліся ў сходных з чытачом жыццёвых абставінах дапамагае знайсці правільны выхад са складанага становішча, умацаваць волю, падараваць жаданне змагацца і перамагаць калізіі лёсу, навучыць заўсёды паступаць прыгожа і высакародна. Чытанне мастацкай літаратуры – гэта свайго роду хуткая псіхалагічная дапамога тым, хто апынуўся ў цяжкіх жыццёвых абставінах і не мае жадання або магчымасці звярнуцца за дапамогай да спецыялістаў ці блізкіх людзей.

Дадзеная функцыя ўласціва і рэкамендацыйным бібліяграфічным рэсурсам. Яны здольны служыць сродкам арыентацыі ў бібліятэрапеўтычных магчымасцях мастацкай літаратуры, у цікавай форме інфармаваць карыстальнікаў аб тых творах, чытанне якіх можа аказаць псіхалагічную дапамогу. Акрамя таго, самі крыніцы рэкамендацыйнай бібліяграфічнай інфармацыі могуць рабіць бібліятэрапеўтычнае ўздзеянне на сваіх чытачоў.

*Генерацыйная функцыя* – здольнасць ІР мастацкай літаратуры, як першасных, так і другасных, служыць асновай для стварэння на іх аснове якасна іншых ІР: бібліяграфічных паказальнікаў, літаратуразнаўчых і літаратурна-крытычных прац, вучэбных дапаможнікаў, хрэстаматый, кніг для чытання і інш.

Такім чынам, ІРМЛ уласціва выкананне шматлікіх спецыяльных функцый, якія неабходна разглядаць на двух узроўнях: 1) функцыі інфармацыйнага забеспячэння розных сфер чалавечай дзейнасці, 2) функцыі рэдуплікацыі. Гэты падыход дазваляе пазбавіцца ад прамога пераносу функцый, уласцівых мастацкай літаратуры як віду дзейнасці, на яе інфамацыйныя рэсурсы і дакладна вызначыць іх наменклатуру і змест.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

˚ *ІТАРАТУРА*


· Ú *Бавин С. П.* Популярная литературная библиография и информационная культура личности : монография. М., 1996.

2. Библиография художественной литературы и литературоведения. М., 1985.

ËÚ *Давыдова М. И.* Библиография художественной литературы и литературоведения: объект, специфика, функции, научная основа : лекция. М., 2002.

÷Ú *Давыдова М. И.* Рекомендательная литературная библиография как средство формирования художественной культуры общества. М., 1993.

‡Ú *Кушнаренко Н. Н.* Документоведение. 4-е изд., испр. Киев, 2003.

›Ú *Лазарук М. А.* Навучанне і выхаванне творчасцю: Педагагічныя роздумы і пошукі. Мн., 1994.

⁄Ú *Сляднева Н. А.* Библиография в системе Универсума человеческой деятельности: Опыт системно-деятельностного анализа. М., 1993.

“ Ú *Соколов А. В.* Информационный подход к документальной коммуникации. Л., 1988.

‚ Ú *Соколов А. В.* Уровни теоретического обобщения библиотечно-библиографического знания // Социально-информационные проблемы библиотековедения и библиографоведения. Л., 1986. С. 10–32.

10. Справочник библиографа. СПб., 2002. Серия «Библиотека».

· · Ú*Столяров Ю. Н.* Документный ресурс : учеб. пособие. для студ. высш. учеб. заведений. М., fl€€· Ú


ÕÀ” ” fl Œ«

Ã∏ øÆ∑¥ º ª ø¥ ©∑∏ ∏ ∑≠´ ª ±∫ º ∑ª Æ≤ ∑ø ∑π ∏ ∫´ ≤Ω∑≤≠ ±∫ ∑∫±Æ ø ∑≤ Æ≠±´ Æ ≠ ±∫ ∫∑Ω∑≤ÚÃ∏ ø´ ∏±Æ ø≠≠ª Æ≠ ∏þ ∏ ∑∫±Æ ø ∑≤ Æ≠±´ Æ ≠ ¯◊ ˜ ´ ≤º ª Æ≠ º ß ≥ øß ∞ª Æ±Æ ©± ß∞ª ≠ ±∫ ∫´ ≤Ω∑≤≠† ≥ ª ø≠ß≠ ª ≥ ∑Ω ©∏∑Ω∏Ω±™ Æ ±∫ ø¥æÆΩ∏ ≠ ±∫ µ≤±©¥ º πª · ø≠ ≠∞ª Ω∑ø¥ ©∏∑Ω∏Ωø≤ æ ´ ≠ª º ±≤¥ß∫±Æ ∫∑Ω∑≤Ú

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ